Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Чаму завязі на агурках засыхаюць і ападаюць

**Завязі агурка могуць жоўкнуць і ападаць у сілу розных абставін. Частка з іх нават не залежыць ад старанняў агародніка. Як дакладна вызначыць, ці ёсць ваша віна ў тым, што культура дрэнна пладаносіць і скідае недаспелыя завязі?**

## Няякаснае насенне

У многіх выпадках, хоць і далёка не заўсёды, у «агурочных» бедах вінаваты вытворца насення. Асабліва часта непрыемныя сюрпрызы падкідваюць шматфункцыянальныя пучковыя партэнакарпічныя гібрыды. Напрыклад, калі на ўпакоўцы з таварам вам абяцаныя залатыя горы, а замест чаканых жаночых кветак «партэнакарпік» пучкамі выкідвае мужчынскія (хоць іх у прынцыпе не павінна быць у такога гібрыда), то вы проста набылі няякасны тавар. Пры гэтым жаночыя кветкі, як правіла, адзінкавыя, цвіценне беднае, а плады сохнуць, не паспяваючы паспець. Паўнавартаснага ўраджаю ў такой сітуацыі можна і не дачакацца. Варта паспрабаваць прышчыпнуць галоўныя плеці і паназіраць за плоданашэннем на пасынках.

## Занадта доўгая плець

Гэта актуальна ў асноўным для раслін, пасаджаных рана. Другі фактар — рэзкія ваганні тэмпературы ў міжсезонне. Апошняе дрэнна ўплывае на здольнасць культуры засвойваць пажыўныя рэчывы, у выніку чаго завязі недаатрымліваюць харчавання і паліву.

Урэгуляваць сітуацыю проста. Выдаліце ўсе лісты, пад якімі ўжо апалі завязі, а таксама размешчаныя ў тых месцах пасынкі. Адрэзак плеці, які вызваліўся, злёгку прысыпце зямлёй, але так, каб падчас паліву вада не агаляла сцябло. Гэта трэба для таго, каб культура нарасціла новыя карані, размешчаныя бліжэй да ўжо пладаносных частак расліны. Так вы дасце шанц ужо наяўнай завязі адужаць і павялічыце верагоднасць паўнавартаснага плоданашэння ў тых, якія толькі знаходзяцца ў працэсе.

Калі вы вырошчваеце агуркі вертыкальным спосабам, зніміце плець са шпалеры, вызваліце ад лісця і пасынкаў яе «адпрацаваны» адрэзак, акуратна зніміце невялікі верхні пласт зямлі каля яго кораня і туды наўкруг складзіце плець. Затым засыпце грунтам, а пры неабходнасці — дасыпце зямлі.

## Няправільны паліў

Агуркі любяць паліў і дрэнна развіваюцца без неабходнага для іх аб'ёму вадкасці. Яны могуць дрэнна завязваць плады. Зрэшты, тое ж самае адбываецца і пры пераліванні. У агуркоў ёсць строга вызначаныя нормы паліву, парушаць якія не рэкамендуецца. У прыватнасці, пасля з'яўлення завязяў і да заканчэння актыўнага збору пладоў паліваць агуркі трэба тройчы на тыдзень, расходваючы да 8-12 л вады на 1 кв. м. Тэмпература вады для паліву павінна быць не меншая за 25-28 °С, каб расліны выкарыстоўвалі неабходны ім аб'ём, а лішкі вільгаці выпараваліся. Адна з прычын страты завязяў — паліў халодная вадой.



## Занадта высокая тэмпература паветра

У выпадку з агуркамі ў перыяд плоданашэння ў яснае надвор'е тэмпература павінна быць у межах 23—26 °С, у пахмурныя дні — 21—23 °С, у начны час — 18—20 °С. Пры больш высокіх значэннях пылок у пчолаапыляльных сартоў ападае, і ўраджаю чакаць не варта. Зрэшты, «партэнакарпікі» таксама не вельмі даруюць спякоту.

## Нерэгулярныя падкормкі

Гаворка не ідзе пра відавочны дэфіцыт нейкага вызначанага элемента (гэта звычайна можна заўважыць, агледзеўшы лісце). Часам раслінам не хапае харчавання ў цэлым, альбо прапорцыі макра- і мікраэлементаў у глебе не дазваляюць некаторым з іх у поўнай меры засвойвацца.

Каб дапамагчы агуркам, у самым пачатку плоданашэння выкарыстоўваюць раствор з 1 ст. л. нітрафоскі на 10 л вады. Праз пару тыдняў у такім жа аб'ёме вады разводзяць 0,5 л каравяку і 1 ст. л. сульфату калію. У жніўні праводзяць пазакаранёвую падкормку з 1 ст. л. суперфасфату і 1 ст. л. сульфату калію на 10 л вады.

## Хваробы і шкоднікі

Прамы і ўскосны ўплыў на плоданашэнне агуркоў могуць аказваць і інфекцыі. У большасці выпадкаў першыя прыкметы відавочныя. Каб нічога не прапусціць, пару разоў у тыдзень уважліва аглядайце расліну. Калі часткі раслін падазрона змянілі колер або на іх з'явіліся плямы, гнілыя месцы, пацямненні, тэрміновa правядзіце апрацоўку плеццяў падыходзячымі прэпаратамі.

Засцярога агуркоў ад шкоднікаў — найважнейшая задача агародніка, бо інакш лёгка можна застацца без ураджаю!

## Дрэннае апыленне

Часам насякомыя не могуць паўнавартасна апыліць агуркі (напрыклад, днём вы хаваеце пасадкі ад спёкі, а ўначы пчолы і іншыя натуральныя апыляльнікі спяць). У гэтым выпадку давядзецца дапамагчы насякомым і зрабіць дадзеную працэдуру самім.

Вазьміце мужчынскую кветку без завязі, паабрывайце ўсе пялёсткі і прыкладзіце яе да ўсіх жаночых кветак.

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.29 | 21.02 | 15.33 |
| Віцебск — | 5.13 | 20.57 | 15.44 |
| Магілёў — | 5.19 | 20.52 | 15.33 |
| Гомель — | 5.21 | 20.42 | 15.21 |
| Гродна — | 5.45 | 21.16 | 15.31 |
| Брэст — | 5.52 | 21.10 | 15.18 |

## Месяц

*Апошняя квадра 31 ліпеня.*

*Месяц у сузор'і Блізнят.*

## Імяніны

*Пр. Марыі, Магдаліны, Аляксея, Карнілы, Міхаіла, Фокі.*

*К. Дамініка, Пратаза, Яна.*



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# ЗАЎТРА




# УСМІХНЕМСЯ

**— Што б ты выбраў: каб на цябе пасварыліся, але далі грошы, ці каб не чапалі, але і грошай не далі?**

**— Гэта залежыць ад таго, ёсць у вас грошы ці будзеце сварыцца ў крэдыт.**

— Ніна, табе даўно замуж пара!

— Ды ніяк не магу нікога знайсці, усё пра твайго Лёву думаю...

— Пра майго мужа?!

— Так! Усё думаю, не дай бог такі ж самы прыдурак трапіцца...



Даты | Падзеі | Людзі

## 4 ЖНІЎНЯ

У краіне

**1676** год — нарадзіўся Дамінік Рудніцкі, пісьменнік, педагог. Месца нараджэння невядомае, але даследчыкі лічаць найбольш верагодным Усходнюю Беларусь. Вучыўся ў Віленскай акадэміі. Выкладаў у езуіцкіх калегіумах у Слуцку, Гродне, Мсціславе, Навагрудку. З 1720-га — у Варшаве, пракуратар Літоўскай правінцыі езуітаў. З 1730-га жыў у Нясвіжы. У рукапісных зборніках Рудніцкага, акрамя польскіх, змешчаныя дзевяць беларускіх вершаў, напісаных ім самім або апрацаваных народных песень. Аўтар інтэрмедый на польскай мове, казанняў.



**1946** год — нарадзілася Вікторыя Мікалаеўна Мазур, спявачка, народная артыстка Беларусі. У 1970—2005 гадах — салістка Беларускага дзяржаўнага музычнага тэатра. Стварыла запамінальныя вобразы ў спектаклях класічнага і сучаснага рэпертуару. Аўтар і рэжысёр шоу-праграмы «Зоркі тэатраззяюць для Вас!»

У свеце

**1881** год — нарадзілася Вольга Васільеўна Кавалёва, руская спявачка, народная артыстка РСФСР. У 1917—1918 гадах выкладала ў Першай народнай музычнай школе, паклала пачатак народнаспеўнаму кірунку ў гэтай навучальнай установе. У 1920-х гадах выступала ў Швецыі, Нарвегіі, Фінляндыі, Францыі і Германіі. У маі 1999-га ў Маскве адбыўся першы адкрыты конкурс юных выканаўцаў народных песень яе імя.



**1901** год — нарадзіўся Луі Армстранг, адзін з найбуйнейшых джазавых музыкантаў і спевакоў мінулага стагоддзя. Арганізатар першых джаз-ансамбляў у Новым Арлеане (ЗША).

**1926** год — нарадзіўся Лівій Сцяпанавіч Шчыпачоў, расійскі жывапісец і партрэтыст. Працы мастака знаходзяцца ў многіх айчынных і замежных музеях і прыватных калекцыях.

Так гаварыў...

**ГЕЛЬВЕЦЫЙ:**

*«Жорсткасць ёсць заўжды вынік страху, слабасці і баязлівасці».*


ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 2165.

Нумар падпісаны ў 19.30 3 жніўня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12